institutions and public organizations providing information on agroecotourism in the Republic of Belarus revealed a number of problems not only in English versions of the site, but also in Russian ones.

***Казаніна В. Ю.***

# ІНТЭГРАТЫЎНАЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ МАСТАЦТВАЗНАЎЦАЎ-АНТЫКВАРАЎ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*
*(Паступіў у рэдакцыю 16.09.2019)*

Пошук сапраўды актуальных форм навуковага дыскурсу народазнаўства сярод беларускіх даследчыкаў сёння не вельмі папулярны. Гэта выклікае праблемы, бо фальклор у XXI ст. (у глабальным маштабе) становіцца ўсё менш запатрабаванай і ўсё больш элітарнай формай мастацтва і пераасэнсавання свету. У той жа час па-за ўвагай навукоўцаў застаецца карэннае арт-асэнсаванне (агучванне, афарбоўванне, рытмізацыя і сімвалізацыя) свету згодна з традыцыямі продкаў. Таму намаганні вучэбна-навуковай лабараторыі фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, перш за ўсё Рымы Кавалёвай і Вольгі Прыемка, а таксама загадчыка лабараторыі (да 2019 г.) Таццяны Марозавай па фарміраванні канцэпцыі, вектараў і прыярытэтаў інтэгратыўнай фалькларыстыкі заслугоўваюць павагі і пільнай увагі даследчыкаў-гуманітарыяў. У 2018 г. была заснавана серыя навуковых выданняў «Інтэгратыўная фалькларыстыка», не проста міжуніверсітэцкая, але і міжнародная (па складзе аўтараў), таму ёсць упэўненасць, што сваю функцыю ўвядзення айчыннай традыцыйнай культуры ў сусветны навуковы кантэкст [10, с. 6] яна пры паспяховым працягу цалкам здольная выканаць.

Інтэгратыўная фалькларыстыка імкнецца пераадолець «састарэлы навуковы аб’ектывізм, які мае на ўвазе зварот да фальклору як да помніка <...> да яго як да суб’екта працэсу эксплікацыі мастацтва вуснай традыцыі» [10, с. 6].

Пра праблематыку і спецыфіку інтэгратыўнасці падыходаў да фальклору, монафальклорнасць, сінтэз і ўзаемадзеянне традыцыйных мастацтваў пісалі Рыма Кавалёва [7], Ігар Мацыеўскі [9, с. 6 – 24], Генрых Арлоў [9, с. 143 – 159]; пра гісторыка-антыкварна-этнаграфічныя даследаванні з інтэгратыўным падыходам – Марыя Гімбутас [3; 11; 12], Роберт Грэйвс [4; 5], Валянцін Даніленка [6], Барыс Рыбакоў [6, с. 5], а таксама шэраг іншых аўтараў.

Мэта артыкула – высветліць, як у працах даследчыкаў, якія апелююць да антыкварнай справы і збірання старажытнасцяў, адлюстраваны такія базавыя канцэпцыі і вектары інтэгратыўнай фалькларыстыкі, як: а) пэўная монафальклорнасць архаічнай протакультуры; б) аналіз узаемасувязяў помнікаў фальклору (у побытавым, сацыяльным і гістарычным кантэкстах) асобных народаў-носьбітаў уласнай арыгінальнай культуры, якія прайшлі перыяд этнагенезу пасля першапачаткова поліэтычнай мастацкай архаікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта інтэгратыўная фальклярыстыка здольная адказаць на шэраг пытанняў агульнага парадку пра прычыны разнастайнасці (а ў некаторых аспектах – адзінства), а таксама каштоўнасць для чалавецтва ўсіх культур і мастацтваў вуснага тыпу. Яна даследуе генезіс такіх мастацкіх жанраў, як паэзія, музыка, тэатр; тэхналогію і форму народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама светапоглядныя вытокі каляндарных і сямейных абрадаў, магіі, шаманізму і г. д. Мастацтвазнаўцы-кампаратывісты грунтуюцца на тым, што ў дапісьмовых архаічных традыцыях гэтыя жанры мастацтва і формы традыцыйнага светапогляду былі больш цесна ўзаемазвязаныя і непадзельныя, чым у перыяд развіцця пісьмовай літаратуры, музыкі, драматургіі, а таксама ў час станаўлення прафесійнага антыкварнага рынку.

Падобныя інтэгратыўныя падыходы выкарыстаў перакладчык, гісторык, міфолаг і антыквар Роберт Грэйвс у кнізе «Белая багіня». На думку Х. Л. Борхеса Р. Грэйвс здолеў у пэўнай ступені рэстаўрыраваць «першую граматыку паэтычнай мовы», а таксама «вярнуць паэзію да яе магічных вытокаў» [1, с. 5].

Сам Р. Грэйвс падкрэсліваў, што да глыбокага інтэгратыўнага асэнсавання тэмы вытокаў вуснапаэтычных тэкстаў і духоўнай протакультуры народаў трох кантынентаў (Еўропы, Азіі і Афрыкі) яго падштурхнулі менавіта антыкварныя артэфакты: гіркі для стaрадаўніх вагаў гандляроў золатам, скульптурныя выявы сфінксаў, кентаўраў, старажытнагрэчаскай Артэміды, заходнеафрыканскай багіні месяца Нгаме, яе жрацоў, старажытнарымскія разьбяныя пячаткі-гемы і г. д. [4, с. 693 – 698]. Для паглыблення ў сімволіку і вобразы паэм сярэднявечных валійскіх і аквітанскіх бардаў, трубадураў, менестрэляў даследчык прааналізаваў архітэктуру еўрапейскіх культавых збудаванняў неаліту і эпохі бронзы – дальменаў, кромлехаў і лабірынтаў. Гэты напрамак па кроскультурным аналізе артэфактаў Міжземнаморскага рэгіёна пасля працягнула Марыя Гімбутас.

Гісторыя сведчыць, што ў сваіх кампаратыўных даследаваннях, якія аб’ядноўваюць інтэгратыўныя падыходы да вуснай і пісьмовай літаратуры, фальклярыстыку і антыкварыянізм, Роберт Грэйвс быў далёка не адзінокім. Яго неаднаразова кансультавалі іншыя знаўцы старажытнасцяў – сучаснікі, якія сумяшчалі антыкварную справу і гуманітарыстыку: Карл Людвіг К’ерсмеер – дацкі юрыст, паэт, калекцыянер афрыканскай скульптуры; нямецкі антыквар і даследчык Георг Шварц і іншыя. Акрамя таго, Р. Грэйвс спасылаецца на працы падобных па поглядах, метадах даследавання і родзе заняткаў навукоўцаў і антыквараў, якія жылі ў папярэднія эпохі. Сярод іх – аўтар археалагічнай працы «Hydryotaphia, ці Паграбенне ў урнах» Томас Браўн, які задаваў цалкам літаратуразнаўчыя пытанні: «Якую песню спявалі сірэны і пад якім імем хаваўся сярод дзяўчат Ахіл?» [4, с. 7]; Томас Гвін Джонс – літаратурны крытык і спецыяліст па старажытнасцях Уэльса [4, с. 19]; Шарлота Гест – перакладчык сярэднявечных тэкстаў і папулярызатар старажытнавалійскай культуры [4, с. 34]; Ёла Морганug – антыквар, паэт і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдавец [4, с. 34]; Оўэн Канелан – ірландскі філолаг, збіральнік старажытнасцяў, а таксама выдавец «Прац Вялікай акадэміі бардаў» [4, с. 36] і іншыя.

Большасць гэтых даследчыкаў у рознай ступені належыць да паслядоўнікаў так званага брытанскага антыкварыянізму XVI – XVII стст. – навукова-практычнай школы назапашвання, вывучэння, публікацый старажытнасцяў, каля вытокаў якой стаяў лорд-канцлер Англіі пры каралі Якаве I Фрэнсіс Бэкан. Ён неаднаразова характарызаваў веды, заснаваныя на вывучэнні старажытнасцяў (antiquitatos) і фрагментаў вуснай творчасці народа («уласных імёнаў і мовы, этымалогіі, прыказак, уяўленняў» [2, с. 170]), як надзвычай важныя, а такога роду даследаванні – ганаровымі, годнымі павагі і падтрымкі. Гатовых інтэгратыўных методык брытанцы ў завершаным выглядзе не прапанавалі, але ў дзейнасці паслядоўнікаў антыкварыянізму яны інтуітыўна прысутнічалі.

Вось як апісвае момант свайго «інтаграцыйнага азарэння» сам Роберт Грэйвс: «Займаючыся кнігай пра арганаўтаў, я выявіў, што Белая Багіня Пеліёна становіцца ўсё больш важнай для майго апавядання. Акрамя таго, у маім працоўным пакоі захоўвалася некалькі заходнеафрыканскіх медных штучак <...> гірак для залатога пяску, у асноўным, фігуркі жывёл, сярод іх – гарбун, які іграе на флейце <...> А пасля я даведаўся, што гарбун быў герольдам царыцы-маці нейкай Аканскай дзяржавы, і што кожная царыца-маці <...> аб’яўляе сябе інкарнацыяй Траістай Багіні месяца Нгаме» [4, с. 694]. Аканы – этнічная супольнасць, якая жыве ў Заходняй Афрыцы, галоўным чынам на тэрыторыі Ганы. Энцыклапедычная адукаванасць Р. Грэйвса дазволіла яму суаднесці антыкварныя артэфакты са звесткамі аб неалітычных культах Міжземнамор’я. Ён атрымаў аснову «светапогляднай матрыцы» архаічных міфалогій памежжа трох кантынентаў (шмат у чым першапачаткова монафальклорнай), што ў далейшым пакінула сляды ў тэкстах, выяўленчым мастацтве, абрадах і традыцыйных мадэлях паводзін народнасцей еўрапейцаў, азіятаў і афрыканцаў, якія ў свой час прайшлі шэраг стадый этнагенезу.

У XX ст. ўспаміны пра матрыярхальныя дахрысціянскія культы і традыцыйны светапогляд Еўропы ўжо існавалі на перыферыі яе культуры. Але наяўнасць інтэгратыўных універсальных сімвалаў, устаноўка на парадаксальную монафальклорнасць розных традыцый дазволіла Р. Грэйвсу рэстаўрыраваць наступную за вызначэннем матрыярхальнага генезісу міфалогій Міжземнамор’я прыступку – сувязь архаічнага светапогляду з абрадавай і паводзінскай культурай, якая прайшла перыяд этнагенезу народаў-спадчыннікаў мясцовай сінкрэтычнай мастацкай архаікі. Апісваючы даследчы вопыт па асэнсаванні ўласнай антыкварнай калекцыі старажытнасцяў аканаў, Р. Грэйвс адзначыў: «На вечцы шкатулкі была выяўлена спіраль, якая дакраналася адным канцом да прамавугольнай рамкі з дзевяццю зубцамі на кожным баку, і гэта азначала: “Няма нікога больш магутнага ў сусвеце, чым Траістая Багіня Нгаме!” Фігуркі і шкатулку зрабілі да таго, як брытанцы захапілі Залаты Бераг» [4, с. 694]. У каланіяльную эпоху

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Залаты Бераг» – назва Ганы, дзе да XX ст. захаваліся артэфакты архаічнага матрыярхальнага культу багіні Нгаме, якія трапілі ў калекцыю Р. Грэйвса.

Шэраг асаблівасцяў антыкварных прадметаў уласнай калекцыі дапамог развіццю далейшых даследаванняў: «Стары Георг Шварц, яўрэйска-нямецкі калекцыянер старажытнасцяў, завяшчаў мне яшчэ пяць або шэсць аканскіх фігурак, сярод якіх была незразумелая фігурка з адным вялікім вокам. Пазней спецыялісты па заходнеафрыканскім мастацтве ідэнтыфікавалі яе як жраца-okrafo аканскага цара» [4, с. 695]. У заходнеафрыканскай міфалогіі «okrafo» (ад «okra» – «чалавек») – персанаж рэлігійных поглядаў, асноўная функцыя якога заключалася ў нашэнні царскай душы. Таму адным з пытанняў для Р. Грэйвса было, чаму душу цара старажытных аканаў і іншых архаічных народаў было неабходна пэўны час захоўваць: «У сваёй кнізе я выказаў меркаванне, што ў архаічным міжземнаморскім грамадстве цара прыносілі ў ахвяру ў канцы тэрміну яго праўлення. Але пасля <...> ён набыў дадатковую ўладу як галоўны міністр царыцы і прывілею прыносіць у ахвяру сваю замену» [4, с. 695].

Супаставіўшы монафальклорныя вытокі міжземнаморскіх рэлігій, аўтар «Белай багіні» прыйшоў да шэрагу абагульненняў. Іх нязначныя дэталі часам аспрэчвалі іншыя даследчыкі, але ніхто з сур'ёзных навукоўцаў не сумняваўся ў адной з інтэгратыўных установак Роберта Грэйвса: «...мова паэтычнага міфа, вядомая ў старажытныя часы ў краінах Міжземнамор'я і Паўночнай Еўропы, была магічнай мовай, неаддзельнай ад рэлігійных абрадаў у гонар багіні месяца <...> застаючыся мовай сапраўднай паэзіі. "Сапраўднай" – у сучасным настальгічным сэнсе "непадробленага арыгінала, а не яго сінтэтычнай замены"» [4, с. 8].

Першапачаткова трактат Р. Грэйвса называўся «Алень ў гушчары», таму ў працяг тэмы антыкварнага таленту аўтара (звязанага з гуманітарна-даследчым) прывядзем яго выказванне: «Калі "Белая багіня" ўжо выйшла ў свет, адзін антыквар у Барселоне прачытаў маіх "Клаўдзяў" запрасіў мяне да сябе, каб я выбраў камень для пячаткі з калекцыі рымскіх самацветаў, што нядаўна трапіла да яго. Сярод іх быў чужынец – сердалікавая з абадком пячатка, якая адносілася да эпохі арганаўтаў і на якой былі выгравіраваны царскі алень <...> і збоку паўмесяц! Гэта таксама можна лічыць выпадковым супадзеннем!» [4, с. 696]. Аднак пры правільным метадалагічным падыходзе супадзенні толькі ўскосна пацвярджаюць аб'ектыўную незалежную ад іх праўду і правілы яе спасціжэння.

Р. Грэйвс неаднаразова тлумачыў, што ён не містык і не сектант, а цалкам рацыянальны чалавек XX стагоддзя, таму яго намаганні нельга разглядаць як фанатычную графаманскую «сізіфаву працу» па пошуку адцягнутасці ісцін. Бо многія высновы, абстрактна сфармуляваныя ім у «Белай багіні» ў 1940-х гадах, пачалі дакументальна пацвярджацца ўжо праз два дзесяцігоддзі (1960 – 1990-я гг.) міжнародна прызнанымі адкрыццямі амерыканскага археолага, антраполага і фалькларыста літоўскага паходжання Марыі Гімбута. Уклад у гісторыю гэтай даследчыцы параўноўваюць з дасягненнямі лінгвіста Франсуа Шампальёна, які ўпершыню расшыфраваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

старажытнаегіпецкія іерогліфы [3, с. 5]. За свае працы Марыя Гімбутас стала членам Амерыканскай акадэміі навук, а газета «Лос-Анджэлес таймс» у 1968 г. абвясціла яе «жанчынай года» [3, с. 8]. У 1970-я гады М. Гімбутас з’яўлялася кіраўніком усіх раскопак неалітычных паселішчаў у Югаславіі, Македоніі, Грэцыі і Італіі, якія фінансаваліся па навуковых праграмах ЗША. Вынікам стала шмат у чым сугучная «Белай Багіні» Р. Грэйвса канцэпцыя культуры Старой Еўропы, апублікаваная ў міжземнаморскай і глабальна арыентаванай трылогіі кніг «Багіні і багі Старой Еўропы» (1974), «Мова Багіні» (1989) і «Цывілізацыя Багіні» (1991). У гэтай трылогіі М. Гімбутас паслядоўна стварыла ідэалізаваную карціну матрыярхальнага даіндаеўрапейскага грамадства Старой Еўропы, заснаванага на роўнасці. На думку даследчыцы, у выніку ўваходу на стараеўрапейскія прасторы намадаў-індаеўрапейцаў на змену «залатому стагоддзю» прыйшла андакратыя – патрыярхальная ўлада, пабудаваная на вайне і гвалце [3, с. 9 – 10]. Р. Грэйвс менавіта ў гэтую эпоху канстатаваў пачатак згасання магічнай «мовы паэтычнага міфа» ў вуснай паэзіі Міжземнамор’я, і такім чынам канцэпцыі, а таксама высновы даследчыкаў супадаюць.

У выніку аналізу звестак аб выкарыстанні інтэгратыўнай фальклarystыкі ў даследаваннях мастацтвазнаўцаў-антыквараў правамерна сфармуляваць наступныя высновы: 1) у сярэдзіне XX ст. даследчык міфалогіі і паэтыкі вуснай і пісьмовай літаратуры Роберт Грэйвс і яго калегі, апелюючы да антыкварнай справы, змаглі інтэгратыўна ахарактарызаваць монафальклорнасць архаічнай Міжземнаморскай традыцыі, звязанай з мясцовымі матрыярхальнымі палеакультамі; 2) інтэгратыўны аналіз узаемадзеяння мастацтваў у вытворных ад дадзенай монафальклорнай традыцыі культурах шэрагу народаў Еўропы, Азіі і Афрыкі прывёў да значных абагульненняў у мастацтвазнаўстве і фальклarystыцы, пацверджаных сумежнымі абласцямі навукі; 3) асабліва наглядна шматлікія гіпотэзы Р. Грэйвса і яго сучаснікаў былі пацверджаны, а таксама развіты археолагам, антраполагам і фальклarystам Марыяй Гімбутас у яе канцэпцыі культуры Старой Еўропы, што сведчыць пра перспектыўнасць і неабходнасць прымянення інтэгратыўнага падыходу ў метадалогіі сучаснай гуманітарыстыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЛІТАРАТУРА**

1. Борхес, Х. Л. Предисловие / Х. Л. Борхес // Белая Богиня : избранные главы / Р. Грейвс ; пер. с англ. Б. Дубинина. – СПб., 2000. – С. 5 – 6.
2. Бэкон, Ф. О достоинстве и приумножении наук / Ф. Бэкон // Сочинения : в 2 т. / Ф. Бэкон. – М., 1971. – Т. 1. – С. 87 – 546.
3. Гимбутас, М. Славяне / М. Гимбутас ; пер. с англ. Ф. Капицы. – М. : Центрполиграф, 2003. – 216 с.
4. Грейвс, Р. Белая Богиня / Р. Грейвс ; пер. с англ. В. Ахтырской. – М. : Иностранка ; Азбука-Аттикус, 2015. – 704 с.
5. Грейвс, Р. Белая Богиня : избранные главы / Р. Грейвс ; пер. с англ. И. Егорова. – СПб. : Амфора, 2000. – 382 с.

6. Даниленко, В. Космогония первобытного общества / В. Даниленко // Начала цивилизации. – Екатеринбург ; М., 1999. – С. 3 – 216.
7. Ковалёва, Р. Интегративные векторы фольклористики / Р. Ковалёва // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. / пад. навук. рэд. Р. Кавалёвай, В. Прыемка. – Мінск, 2011. – Вып. 8. – С. 305 – 310.
8. Котляр, Е. Ашанти мифология / Е. Котляр // Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. В. Токарев. – М., 1987. – Т. 1. А – К. – С. 142 – 143.
9. Сравнительное искусствознание – XXI век / ред.-сост. О. Колганова ; отв. ред. И. Мациевский. – СПб. : РИИИ, 2014. – Вып. 1. Наследие Генриха Орлова и актуальные проблемы современного сравнительного искусствознания. – Ч. 1. – 160 с.
10. Цень Стралы: культурныя і вербальныя коды традыцыі / пад навук. рэд. Р. Кавалёвай, В. Калацэя. – Мінск : Права і эканоміка, 2018. – 190 с.
11. Gimbutas, M. The Gods and Goddesses of Old Europe: 7000 to 3500 BC Myths, Legends and Cult Images / M. Gimbutas. – Los Angeles : University of California Press, 1974. – 303 p.
12. Gimbutienė, M. Baltų mitologia : senovės lietuvių deivės ir dievai / M. Gimbutienė. – Vilnius : Lietuvos rašitojų s-gos liedukla, 2002. – 164 p.

РЕЗЮМЕ

В статье анализируются исследования антикваров, где задействованы такие базовые концепции интегративной фольклористики, как монофольклорность архаичной протокультуры, а также анализ памятников фольклора в бытовом, социальном и историческом контексте. Автор приходит к выводу, что возникновение исследовательских методик, направленных на анализ взаимодействия искусств, обычно происходит из-за ненадлежащей сохранности исследовательского материала. Результаты интеграционного исследования затем, как правило, подтверждаются смежными областями науки.

SUMMARY

The article analyzes how such basic concepts of integrative folklore as ethnopsychology of the mono-folklore of the archaic protoculture are involved in antiquarian studies, as well as the fact that the analysis of the folklore monuments in everyday, social and historical contexts always follow the specific syncretical ethnogenesis. The author concludes that the emergence of research techniques aimed at analyzing the synthesis and interaction of the arts usually causes poor preservation of the material under study, and the conclusions obtained from the integrative study, as a rule, are subsequently confirmed by related fields of science.

***Мазур В. П.***

# К ВОПРОСУ ОБ УНИКАЛЬНЫХ РЕЗНЫХ ЭЛЕМЕНТАХ В ИНТЕРЬЕРЕ ДЕРЕВЯННОЙ ЦЕРКВИ ПОКРОВА ПРЕСВЯТОЙ БОГОРОДИЦЫ В СЕЛЕ КРЕНИЧИ ОБУХОВСКОГО РАЙОНА КИЕВСКОЙ ОБЛАСТИ

*Национальная академия изобразительного искусства и архитектуры, г. Киев*
*(Поступила в редакцию 16.09.2019)*

Деревянная Покровская церковь в селе Креничи Обуховского района Киевской области, возведённая по примеру древних образцов деревянного зодчества, не раз становилась объектом исследования не только архитекторов, но и краеведов. В научных изданиях по истории архитектуры отмечено, что церковь построена в 1761 г. по инициативе игуменьи Иоанно-Богословского женского монастыря Ксанфии Протанской. В 1850 г. здание



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ